ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984
14
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 21 (1434)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

НА РАСШЫРАНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

партыйнага камітэта універсітэта абмяркоўваліся задачы партыйных і камсамольскіх арганізацый, дэканатаў, кафедраў, аддзелаў і служб БДУ па аказанню шэфскай дапамогі па нарыхтоўцы кармоў калгасам і саўгасам рэспублікі на летні перыяд.

Прысутныя заслухалі інфармацыю начальніка штаба па арганізацыі сельскагаспадарчых работ прарэктара універсітэта Л. М. Давыдзенкі аб ходзе шэфскай работы ў саўгасе «Гарадок» Уздзенскага раёна і задачах калектыву БДУ па ўзмацненню шэфскай дапамогі па нарыхтоўцы кармоў у летні перыяд. З паведамленнем аб магчымасцях удзелу сельскагаспадарчых атрадаў БДУ ў шэфскай рабоце па нарыхтоўцы кармоў выступіў сакратар камітэта камсамола А. Казулін.

У пастанове, прынятай на расшыраным пасяджэнні парткома, рэкамендавана партыйным і камсамольскім арганізацыям, дэканатам, кафедрам, аддзелам і службам універсітэта прыняць да выканання план-графік аказання шэфскай дапамогі па нарыхтоўцы кармоў у саўгасе «Гарадок» Уздзенскага раёна.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

НА ЛЕТНІ ПЕРЫЯД

запрашае лагер працы і адпачынку «Феадасійскі». Ён пачне сваю работу 25 чэрвеня і будзе прымаць студэнтаў да 25 верасня. Работа лагера арганізавана ў чатыры змены, кожная з якіх зможа прыняць 60 чалавек.

630 студэнтаў змогуць правесці летнія канікулы ў спартыўна-аздараўленчым лагеры «Нарач». Ён будзе працаваць з 1 ліпеня да 28 жніўня ў тры змены.

П. ЛАПЦЁНАК,
намеснік старшыні студэнцкага прафкома.

САВЕТ

універсітэта на чарговым пасяджэнні абмеркаваў кандыдатуры на абранне членамі-карэспандэнтамі і акадэмікамі Акадэміі навук БССР. Разгледжаны некаторыя арганізацыйныя пытанні.

Л. МАРЦЫЁНКА.

СЯРЭБРАНЫМ ПРЫЗЁРАМ

стала каманда замежных студэнтаў, што вучацца ў БДУ імя У. І. Леніна. Яна заняла 2-е месца ў 10-й спартакіядзе замежных навучэнцаў г. Мінска.

А. ВАЛЬВАЧОЎ.

● ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА СЕМЕСТРА ●

НА СТАРЦЕ — ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА

НЕ ПЕРШЫ год працуе на Пскоўшчыне занальны штаб СБА, які фарміруецца універсітэтам. Сёлета пад кіраўніцтвам Апочэцкага штаба будуць працаваць 16 атрадаў з Беларусі, сярод якіх тры універсітэцкія.

Атрады Белдзяржуніверсітэта, Мінскага і Гродзенскага медінстытутаў, Брэсцкага інжынерна-будаўнічага, Гомельскага кааператыўнага, Брэсцкага педагагічнага інстытутаў і Гродзенскага універсітэта выканаюць значны аб'ём работ на аб'ектах сельскай гаспадаркі васьмі раёнаў Пскоўскай вобласці. Два атрады Беларускага політэхнічнага інстытута будуць займацца мантажом высакавольтных ліній электраперадач, сумяшчаючы работу ў СБА з вытворчай практыкай. Беларускімі атрадамі будзе асвоена каля 1 млн. рублёў капіталаўкладанняў. У Апочэцкім занальным атрадзе будуць таксама працаваць 14 пскоўскіх СБА і атрад Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта.

Зараз завяршаецца падрыхтоўчы перыяд. Не сакрэт, што ад таго, наколькі эфектыўна папрацуюць у гэты час СБА, залежаць іх поспехі летам. Большасць атрадаў Апочэцкага занальнага СБА гатовы не толькі да высокапрадукцыйнай працы, але і да актыўнай грамадска-палітычнай работы. Ва ўсіх атрадах падрыхтаваны і ўжо чыталіся ў падрыхтоўчы перыяд лекцыі, гатовы да выступлення агітбрыгады. Летам у атрадах пройдуць Усесаюзны камсамольскі сход «З імем Леніна на працу і на подзвіг», прысвечаны 60-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна, працоўная патрыятычная вахта, прысвечаная 30-годдзю асваення Цаліны, мітынг «Я галасую за мір», іншыя мерапрыемствы, падрыхтоўка да якіх вядзецца ўжо сёння.

Выклікае трывогу стан спраў ва універсітэцкіх атрадах. Так, па вынніках сацыялістычнага спаборніцтва за падрыхтоўчы перыяд толькі адзін атрад БДУ — «Няміга» (юрфак) — у ліку лепшых. Камандзір атрада М. Дубёнак і камісар І. Папко добра справіліся са сваімі абавязкамі ў падрыхтоўчы перыяд.

Да сённяшняга дня працягваецца фарміраванне атрада «Радар» факультэта радыёфізікі і электронікі. Частка атрада да гэтага часу не прайшла медыцынскага агляду, не зроблены неабходныя прышчэпкі.

Ёсць, безумоўна, і аб'ектыўныя прычыны. Да іх, у прыватнасці, адносіцца недастатковая база фарміравання СБА на факультэтах. І ўсё ж пры фарміраванні атрадаў імя П. І. Клімука і «Радар» дапушчаны пралікі і недахопы камітэтамі камсамола і штабамі працоўных спраў факультэтаў.

Так, на фізічным факультэце штаба працоўных спраў фактычна няма, як няма і яго камандзіра. Усю работу спрабуе выконваць камісар ШПС, але аднаму чалавеку гэта проста не пад сілу. А ў сакратара камітэта камсамола А. Слабадзенюка, напэўна, рукі не даходзяць да таго, каб хаця б наладзіць кантроль за дзейнасцю СБА.

Самаўхіліўся ад работы па фарміраванню СБА і арганізацыі іх дзейнасці ў падрыхтоўчы перыяд начальнік ШПС факультэта радыёфізікі і электронікі А. Гуцікаў. Не так даўно на пасяджэнні бюро камітэта камсамола БДУ яму была аб'яўлена строгая вымова, але належных вывадаў з гэтага не зроблена. Камітэт камсамола факультэта пераклаў усю работу па арганізацыі дзейнасці СБА ў апошнія дні падрыхтоўчага перыяду на партбюро і дэканат. Напэўна, бюро камітэта камсамола патрэбна будзе яшчэ ў чэрвені вярнуцца да разгледжання работы ШПС фізфака і факультэта радыёфізікі і электронікі.

Ю. ВАРАТНІЦКІ,
камісар занальнага штаба СБА,
член камітэта камсамола БДУ.

● ФОТА ТЫДНЯ ●

ДЫПЛОМНАЯ РАБОТА... Як падлічыць усе студэнцкія намаганні, укладзеныя ў яе? Затрачаным часам, колькасцю напісаных старонак? Або кнігамі, якія студэнт прачытаў пры падрыхтоўцы? Як ацаніць усю гэту працу і паставіць справядлівую адзнаку? У многім гаворыць за сябе дыпломная работа. Але яшчэ больш выяўляе веды студэнта-дыпломніка дэталёвасць распрацоўкі абранай ім тэмы, яго выступленне пры абароне дыпломнай работы. Кожны прысутны можа задаваць пытанні, аспрэчваць аргументы выступаючага. А ў спрэчках, як вядома, нараджаецца ісціна.

Гэтыя здымкі зроблены нашым фотакарэспандэнтам на хімічным факультэце.

НА ЗДЫМКАХ: ідзе абарона дыпломных работ; хвалюецца Святлана Гайдук, хвалюецца, але... трэба перамагчы сябе, трэба; заўвагі па дыпломнай рабоце робіць намеснік дэкана В. В. Самахвал; абарона дыплома — гэта не проста выкладанне ведаў, тут важна і цікава пабудаваць сваё выступленне, завалодаць увагай прысутных. Добра разумее гэта Алег Садоўскі, таму не-не ды і чуюцца ў яго словах ноткі гумару; вось-вось патрэбна будзе выступаць Вользе Пшанічнай, і яна апошні раз раіцца са сваім кіраўніком; уважліва слухаюць сваіх таварышаў Святлана Галаўко і іншыя прысутныя.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

АДГУКАЕЦЦА ПАМЯЦЬ ПАВЕРКАЙ

МІНСК. 1942 год... Каменданцкі час. На вуліцах — шматлікія патрулі. Масавыя аблавы, арышты, катаванні. Азвярэлыя гітлераўцы з СС, агенты СД, тайная паліцыя, жандармерыя, паліцыя аховы правапарадку, контрразведка абвера...

Тэрорам, пагромамі і шыбеніцамі, масавымі расстрэламі ўводзілі фашысцкія акупанты так званы «новы парадак».

А звесткі з франтоў таксама даходзілі несуцяшальныя: вораг падступіў да Масквы, пачаў блакаду Ленінграда. Фашысцкія газеты трубілі аб тым, што вось яна — іх перамога... Сваім халуям фашысты ўжо рыхтавалі пропускі для «экскурсіі» ў Маскву.

Але і ў гэтыя, самыя чорныя дні фашысцкай акупацыі на беларускай зямлі, у сталіцы нашай рэспублікі ні на дзень, ні на час не спынялася барацьба партызан і падпольшчыкаў з ворагам.

«Група савецкіх работнікаў»—так называлася падпольная партыйная група, якую узначальвала М. Б. Осіпава. Падпольшчыкі вялі прапагандысцкую работу, збіралі зброю, боепрыпасы, перапраўлялі патрыётаў у партызанскія атрады.

Адным з членаў «Групы» ў гэты час была Францішка Якаўлеўна Злоткіна. Франя добра валодала польскай і нямецкай мовамі. З дапамогай таварышаў яна ўладкавалася на работу перакладчыцай у чыгуначную бальніцу. Справа ў тым, што толькі тут можна было дастаць бланкі, пасведчанні, з дапамогай якіх дазвалялася свабодна ездзіць па чыгунцы, а таксама хадзіць па вуліцах горада. Іменна такія дакументы былі неабходны партызанам і падпольшчыкам.

І Франя здолела выканаць баявое заданне.

Зноў і зноў ляцелі пад адхон цягнікі, зрываліся графікі работы ў дэпо і рамонтных майстэрнях. Так кавалася наша перамога. У рабоце гэтай усенароднай «кузні» была частка нялёгкай, рызыкоўнай працы Ф. Я. Злоткінай, у пасляваенны час — выкладчыцы кафедры замежных моў БДУ імя У. І. Леніна.

Аб баявым шляху Францішкі Якаўлеўны, а таксама яе сябровак па кафедры — байца-аўтаматчыка жаночай добраахвотнай брыгады, што абараняла Маскву, Ганны Вікенцьеўны Янушкевіч, перакладчыцы, працаваўшай па лендлізу з саюзнымі дзяржавамі ў Архангельску, а потым ва Уладзівастоку Таццяны Фёдараўны Кованавай даведаліся супрацоўнікі кафедры замежных моў на вечары, прысвечаным 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Выкладчыца Л. М. Няхай, адна з арганізатараў вечара, пажартавала:

— Сёння ў нас сабралася ўся пасляваенная кафедра...

Сапраўды, на вечар прыйшлі не толькі выкладчыкі і супрацоўнікі, што зараз выкладаюць ва універсітэце, але і былыя франтавікі, ветэраны працы, пенсіянеры: Я. Я. Шкапакова, Б. Г. Шнеярсон, Л. К. Хурсік і многія іншыя.

Для іх, выкладчыкаў і гасцей кафедры, Л. В. Хвядчэня, С. І. Захарава, Т. В. Елісеева, Г. Д. Прахарэнка, С. І. Карасцянёва, В. Б. Коваль падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю, конкурс на лепшыя кулінарныя вырабы, жартоўную латарэю, песні па заяўках...

В. ЧАРНЯЎСКІ.

НА ЗДЫМКУ: у час сустрэчы на кафедры.

Фота аўтара.

„ІНШАГА ДЗЯЦІНСТВА

ГЭТА ПАСЯДЖЭННЕ кафедры глебазнаўства і геалогіі геаграфічнага факультэта было не зусім звычайным: усе сабраліся, каб павіншаваць з 60-годдзем намесніка дэкана завочнага факультэта, дацэнта кафедры Уладзіміра Уладзіміравіча Стэцко. Яму сёння — самыя шчырыя пажаданні, самыя ўдзячныя словы павагі і прызнання яго былых вучняў, сённяшніх калег па працы, усіх, хто яго ведае.

— Сімвалічна, — сказаў загадчык кафедры дацэнт Валерый Станіслававіч Аношка, — што дзень свайго нараджэння Уладзімір Уладзіміравіч заўсёды сустракае ў экспедыцыях, дзе прайшла значная частка яго жыцця.

Не забылі павіншаваць юбіляра і ўручыць адрас супрацоўнікі факультэта, калегі з Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР, Інстытута глебазнаўства і аграхіміі (дарэчы, у інстытутах працуе шмат вучняў У. У. Стэцко). У сувязі з шасцідзесяцігоддзем У. У. Стэцко ўзнагароджаны Граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР «За шматгадовую і плённую педагагічную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці».

Старшыня савета ветэранаў універсітэта І. В. Марчанка ўручыў удзельніку Вялікай Айчыннай вайны У. У. Стэцко падзяку Савецкага камітэта ветэранаў вайны за актыўны ўдзел у рабоце па гераіка-патрыятычнаму выхаванню моладзі і адрас прэзідыума Мінскай секцыі Савецкага камітэта ветэранаў вайны.

З прывітальнымі словамі выступілі Р. А. Жмойдзяк — дэкан геафака, М. Т. Раманоўскі — былы дэкан факультэта, настаўнік Уладзіміра Уладзіміравіча, А. М. Вітчанка — старшыня факультэцкага савета маладых вучоных, А. Р. Сінякова — загадчыца кафедры фізічнай геаграфіі СССР.

ДЗЯЦІНСТВА. Якім бы яно ні было, лёгкім ці цяжкім, яго заўсёды ўспамінаеш з нейкай асаблівай, светлай радасцю ў душы і адначасова з тугой на сэрцы. Гэта тое, чаго ніколі, ні пры якім жаданні не вернеш.

Нялёгкімі былі дзіцячыя гады Уладзіміра Уладзіміравіча. Нарадзіўся і вырас ён у вёсцы Грабава, што на Зэльвеншчыне. У бацькоў, акрамя Валодзі, старэйшага сына, як кажуць, сядзела на лаўках яшчэ пяцёра. Каб пракарміць такую сям'ю ў той час у Заходняй Беларусі, патрэбна было шмат працаваць. Бацькам дапамагалі ўсе дзеці, але больш за астатніх даставалася Валодзю.

Калі Уладзіміру споўнілася сем гадоў, пайшоў у школу. Заходняя Беларусь у той час знаходзілася пад панскай Польшчай. І ўявіце сабе, як цяжка было беларусам вучыцца ў школе, дзе ўсе прадметы выкладаліся на польскай мове. Нават размаўляць вучням паміж сабой па-беларуску забаранялася. А якія парадкі былі тады ў школах. За самую малую правіннасць — білі. Але Уладзіміру пашанцавала: ён быў здольным хлопчыкам і вучыўся добра.

Пакутаваў беларускі народ пад прыгнётам польскіх паноў. Але людзі верылі ў светлае будучае, у тое, што прыйдзе і на іх вуліцу свята вызвалення. Верыў у гэта і Валодзя. Ужо тады, у тыя дзіцячыя гады, паявілася ў юнака лютая нянавісць да польскіх паноў. І з дня ў дзень мацнела любоў да свайго народа, да сваёй Радзімы.

— Памятаю трыццаць сёмы, — расказвае У. У. Стэцко.— Я, тады трынаццацігадовы юнак, быў проста перапоўнены энергіяй. Як сёння, уяўляю майскія святы. З якой ахвотай мы дапамагалі старэйшым развешваць сцягі на паліцэйскіх участках, удзельнічалі ў дэманстрацыях! Мы былі ўпэўнены, што дапамагаем вызваленню Заходняй Беларусі ад польскіх паноў.

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі Валодзя працягваў вучобу ў Дзярэчынскай сярэдняй школе, а потым у Слонімскай беларускай сярэдняй школе і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны закончыў дзесяць класаў.

Суровыя гады вайны... Не можа Уладзімір Уладзіміравіч без болю ўспамінаць гэты час. Колькі давялося вынесці і вытерпець, перанесці голад і холад, не ўпасці духам, выстаяць і выжыць. А выжыць сапраўды было вельмі цяжка. Не раз глядзеў смерці ў твар.

З самага пачатку Вялікай Айчыннай сям'я Стэцко мела сувязь з партызанамі: збіралі п

ТСН У ВНУ

АД ДОШКІ ДА ЭВМ,

АБО ОДА ТЭХНІЧНЫМ СРОДКАМ НАВУЧАННЯ

Ці хацелі б вы пагуляць у крыжыкі-нулікі з вылічальнай машынай! Напэўна, многія выкажуць жаданне. Наколькі гэта ажыццявіма! Той, хто ў мінулым годзе пабываў на дні адкрытых дзвярэй у Маскоўскім інстытуце электроннага машынабудавання, не толькі хацеў, але і змог. А той, хто здаваў уступныя экзамены ў Маскоўскім інстытуце сталі і сплаваў, трымаў «аўтаматызаваны» экзамен, гэта значыць замест выкладчыка веды абітурыента ацэньвала ЭВМ. У сувязі з гэтым прыламінаюцца словы з дзіцячай песні: «До чего дошел прогресс, до невиданных чудес». І сапраўды, справы, якія падуладны зараз машынам, усё больш і больш прымушаюць здзіўляцца. Прагрэс не толькі закрануў, але і карэнным чынам змяніў тэхнічныя сродкі навучання, аб чым яскрава сведчыць прыклад маскоўскіх ВНУ. Магчымасці ёсць. Ёсць добрыя прыклады. Але чамусьці на большасці заняткаў ва універсітэце, як і раней, вяршыняй тэхнічнага прагрэсу застаецца дошка. Наш карэспандэнт вядзе размову на гэту тэму з загадчыкам кафедры ядзернай фізікі прафесарам С. С. ШУШКЕВІЧАМ.

— Справа ў тым, што мы перажылі нямала кампаній па шырокаму ўкараненню ТСН у вучэбны працэс, напісалі справаздачы, а большасць вучэбных заняткаў захоўваюць традыцыйную форму, якая склалася ў эпоху паяўлення першых універсітэтаў, прыкладна 800 гадоў назад. Устанавілася яна яшчэ ў больш глыбокай старажытнасці, калі ў руках навучэнцаў не было ні кніг, ні падручнікаў. Кніга была рэдкасцю, даступнай толькі прафесару (настаўніку), які, прачытаўшы яе, перадаваў інфармацыю вучням. Хутка паявіўся і першы ТСН—класная дошка. Адзначу, што добрая дошка — цудоўны ТСН.

— Станіслаў Станіслававіч, атрымліваецца нешта накшталт оды дошцы...

— Так. У людзей пераважае зрокавая, а не слыхавая памяць. Веды ж перадаюцца на лекцыях у большасці выпадкаў голасам, успрымаюцца на слых. Шлях паляпшэння перадачы ведаў—ператварэнне інфармацыі ў форму, якая ўспрымаецца зрокам. Даўнішні сродак візуалізацыі — класная дошка. Сродак добры, але існуюць і іншыя метады, напрыклад, дыя-, эпі- і кадаскапічная праекцыя. Дыяпазітывы шырока выкарыстоўвалі пры чытанні лекцый студэнтам прафесары Жукоўскі і Ціміразеў яшчэ ў мінулым стагоддзі, а сам дыяпраектар, або «чароўны ліхтар» вынайдзены нямецкім прыродазнаўцам Атанаціусам Кірхерам у 1640 годзе.

— А Энрыка Фермі сам рыхтаваў канспекты для слухачоў, размнажаючы запісы асноўных палажэнняў лекцыі на капіравальным станку, і раздаваў іх студэнтам...

— Не магу не звярнуць увагу і на гэты, вельмі просты, але вельмі добры сродак павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу. Для гэтага не патрэбна ніякай асаблівай тэхнікі, нават без пішучай машынкі можна абысціся.

Разам з тым паяўляюцца цудоўныя магчымасці не толькі для павышэння эфектыўнасці самастойнай работы студэнтаў, «паляпшэння студэнцкага жыцця», але і для форм кантролю якасці лекцый, нарэшце — для развіцця і ўдасканалення форм сацыялістычнага спаборніцтва ў галіне педагагічнай працы, для назапашвання станоўчага вопыту, які захоўваецца нават пры ўходзе супрацоўніка.

— Станіслаў Станіслававіч, з якіх кампанентаў складваецца эфект станоўчага ўздзеяння тэхнічных сродкаў на працэс навучання! Як пры дапамозе гэтых сродкаў можна павысіць каэфіцыент карыснага дзеяння студэнта!

— Па першае, «разбаўленне» манатоннага вяшчання зніжае стамляльнасць і садзейнічае лепшаму выкарыстанню рэсурсаў мозгу.

У сувязі з рэформай школы ў апошні час часта цытуюць словы К. Маркса: «Адно толькі вучэнне не толькі бясплоднае, але і прама на шкоду дзецям, растрачвае іх час, здароўе і энергію...» К. Маркс падкрэсліваў, што навучанне дзяцей павінна базіравацца на змене відаў дзейнасці.

Студэнты, зразумела, больш вынослівыя, чым дзеці, але і іх здольнасці да ўспрымання можна прытупіць манатоннасцю і аднастайнасцю. Па-другое, візуальны, або зрокавы канал перадачы даных мае значна большую прапускную здольнасць, чым гукавы, таму эфектыўнасць перадачы інфармацыі павялічвае ролю кіно і відэазапісу. Успомніце перадачу «Час». За трыццаць мінут вы атрымліваеце добрае ўяўленне аб падзеях у любым кутку зямнога шара. Перадача эквівалентных звестак па радыё, гэта значыць па гукавому каналу, патрабуе больш часу і больш стоміць слухача. Яшчэ прыклад: паўтарагадзінны прагляд кінафільма, пастаўленага добрым рэжысёрам, дае ўяўленне аб мастацкім творы, чытанне якога зойме не менш як 10—12 гадзін. (Але я не заклікаю замяніць чытанне).

вёсках вопратку, хлеб, соль. Бацька ўдзельнічаў у пашкоджанні тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі. За ўдзел у падрыве чыгункі Слонім—Ваўкавыск бацьку схапілі і пасадзілі ў канцэнтрацыйны лагер пад Беластокам. (Тут ён пакутаваў аж чатыры гады). Ад рук нямецка-фашысцкіх акупантаў загінуў брат. Усе клопаты пра сям'ю ляглі на плечы семнаццацігадовага юнака.

Але тыя, хто першымі дасягнулі берага, не вытрымалі і закрычалі: «Фрыцы, здавайцеся!». Фашысты адразу ацанілі становішча і адкрылі суцэльны агонь па катэрах, якія засталіся ў моры. Паступіла каманда: пакінуць катэры! Усе кінуліся ў ваду. Мне таксама нічога не заставалася рабіць, як прыгаць за астатнімі. Але плаваць я не ўмеў. Апамятаўся толькі на беразе, а як апынуўся там, і да сённяшняга дня не ведаю. Нягледзячы на гэта, атака ўдалася. Мы выгналі з Піллау фашыстаў і авалодалі горадам.

ШЧАСЦЯ НЕ ЗЫЧУ...“

І тут зноў няшчасце: Валодзя захварэў тыфам.

— Не ведаю, можа мне, наадварот, пашанцавала,— успамінае У. У. Стэцко. — Іменна хвароба выратавала мяне ад смерці, а потым і ад угону ў Германію.

Але колькі яшчэ смярцей давядзецца перажыць Уладзіміру Уладзіміравічу, пакуль прыйдзе такі доўгачаканы дзень — Дзень Перамогі.

Яшчэ зусім неакрэпшага, перанёсшага цяжкую форму тыфу, Уладзіміра выклікалі ў ваенкамат. Паглядзеўшы на схуднелага — адна скура ды косці — хлопца, у ваенкамаце вырашылі не накіроўваць яго на фронт. Але дзе там! Хлопец аказаўся не з маўклівых, і ў ваенкамаце вымушаны былі адправіць Уладзіміра на фронт. Гэта было ў 1944 годзе. І да канца Айчыннай ваяваў у саставе 11-й гвардзейскай арміі III Беларускага фронту.

— Што больш за ўсё запомнілася? — перапытвае Уладзімір Уладзіміравіч. — Цяжка сказаць. Я ваяваў усяго дзевяць месяцаў. Але чаго толькі не пабачыў за гэты час, чаго не перажыў! Я яшчэ раз сам пераканаўся ў мужнасці і стойкасці нашых салдат. Ведаеце, як у песні пяецца: «Когда страна прикажет быть героем, у нас героем становится любой». Вось дзе сапраўды правільныя словы.

На вайне не бывае лёгкіх дарог, нязначных эпізодаў. Кожны дзень на фронце — эпізод жыцця, якое можа спыніцца ў любую мінуту. Многія баі стаяць перад вачыма і сёння. Не даюць спанойна спаць. І кожны з іх паклаў свой адбітак на загартоўку характару, волі, вытрымкі ў такі цяжкі для ўсіх савецкіх людзей час.

...Пасля ўзяцця Кёнігсберга паступіў загад: авалодаць горадам Піллау (сёння Балтыйск). Нас навучылі крыху вядзенню вулічных баёў. Але што гэта была за вучоба, самі разумееце. Патрэбна было рухацца наперад. Камандаванне паставіла задачу: «Піллау браць з мора». Мы пагрузіліся на катэры і павінны былі без шуму высадзіцца на супрацьлеглым беразе.

Ёсць такі выраз: воля выпадку. Ва Уладзіміра Уладзіміравіча Стэцко было імгненне, калі ён сапраўды адчуў: тое, што ён застаўся жыць,— воля выпадку. А здарылася вось што.

Чырвоная Армія вяла вулічныя баі ў Кёнігсбергу. Са страшэннай цяжкасцю воіны адбівалі ў гітлераўцаў адзін дом за другім. Заняўшы чарговы будынак, байцы пачалі займаць зручныя для абароны пазіцыі. Нечакана для ўсіх да дома пад'ехаў нямецкі браняпоезд (непадалёку праходзіла чыгунка) і пачаў абстрэльваць яго. Раптам Уладзімір Уладзіміравіч адчуў нейкі невялікі штуршок у грудзі, неяк імгненна пахаладзела на сэрцы. «Забіты!» — прамільгнула ў галаве. Але свядомасць не страчваў: «Значыць, жывы». Выратавала тое, што ў кішэні, якраз з левага боку, ляжаў невялікі фотаальбом. Куля трапіла якраз у яго. І сёння, як самыя дарагія рэліквіі, захоўвае Уладзімір Уладзіміравіч куртку і альбом, якія некалі выратавалі яму жыццё...

Дзень Перамогі У. У. Стэцко сустрэў на маршы: на пяхотнай дарозе ад Кёнігсберга да Ліепаі. Колькі тут было радасці!

Радзіма высока ацаніла мужнасць і гераізм салдата ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ён узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга» і «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

— Пасля дэмабілізацыі, — расказвае У. У. Стэцко, — пайшоў працаваць настаўнікам пачатковых класаў Дзяржчынскай сярэдняй школы Зэльвенскага раёна. Завочна вучыўся у педагагічным вучылішчы. Экзамены здаў экстэрнам і пасля заканчэння вучылішча паступіў у БДУ. У нас, пасляваенных студэнтаў, была вялікая прага да ведаў, жаданне вучыцца, хаця мы не мелі для гэтага такіх магчымасцей і ўмоў, як сённяшнія студэнты.

Памяшканне, дзе праходзілі заняткі, не ацяплялася, ложкаў і бялізны не было, — працягвае Уладзімір Уладзіміравіч. — Ложкі здабывалі ў разбураных дамах. А пакольк на ўсіх нас іх не хапала, то спалі па чарзе. Ды і які гэта быў сон: спаць клаліся вельмі позна. З раніцы да вечара працавалі, а потым да самай глыбокай ночы вучыліся. Працаваць даводзілася шмат. Асабліва на аднаўленні вучэбных карпусоў, якія былі разбураны ў час бамбёжкі горада.

...І вось ужо больш за дваццаць гадоў У. У. Стэцко працуе ў БДУ імя У. І. Леніна. Больш за дваццаць гадоў яго навукова-педагагічнай дзейнасці звязана з вывучэннем прыродных рэсурсаў Беларусі і падрыхтоўкай высокакваліфікаваных спецыялістаў — географаў, геолагаў, глебазнаўцаў, якія зараз працуюць у многіх галінах народнай гаспадаркі. Прадметам вялікай увагі вучонага было і застаецца вывучэнне геалогіі карысных выкапняў рэспублікі, асабліва беларускага Палесся. Вялікі інтарэс да прыроды і багаццяў нетраў гэтага краю, настойлівая праца даследчыка вянчаецца значнымі навуковымі і практычнымі рэзультатамі. У. У. Стэцко апублікавана больш за сто работ па геалогіі антрапагена, глебазнаўству, медыцынскай і фізічнай геалогіі, геаграфіі. (Патрэбна адзначыць, што, акрамя гэтага, надрукавана шмат работ па прынцыпах і метадах паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй). Высокай ацэнкі заслугоўвае і ўклад даследчыка ў вывучэнне глебавага покрыву Беларусі, добра вядома работа па вывучэнню лёсавых адкладанняў. Пры непасрэдным удзеле У. У. Стэцко праводзілася састаўленне схемы асушэння і асваення балот і забалочаных зямель беларускага Палесся.

60 гадоў... Многа гэта ці мала? Адназначна адказаць тут нельга. Таму што жыццё чалавека вымяраецца сваёй, асаблівай меркай. І галоўнае — як пражыты гады.

Сёння, віншуючы Уладзіміра Уладзіміравіча Стэцко з шасцідзесяцігоддзем, жадаем яму шчасця, здароўя, плёну ў працы!

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

ТВОЙ ВОЛЬНЫ ЧАС — ТВАЁ БАГАЦЦЕ

АДРАС СУСТРЭЧЫ— «КРАСАВІК»

Вы былі на факультэце прыкладной матэматыкі! Калі так, то, напэўна, бачылі на другім паверсе стэнд, на якім вялікімі літарамі напісана: «Красавік». Гэта назва студэнцкага клуба, што знаходзіцца на вуліцы Кастрычніцкай у інтэрнаце № 6.

КАЛІ Ў КАМІТЭЦЕ камсамола факультэта я загаварыла пра іх клуб навукі і мастацтва, у адказ пачула:

— «Красавік — гэта цікава, як цікава заўсёды, калі знаходзішся сярод людзей, з якімі цябе звязваюць агульныя інтарэсы. Ідзеш у клуб з радасцю, бо можна вынесці шмат карыснага для сябе. Там можна сустрэцца з цікавымі людзьмі і проста са сваімі сябрамі-студэнтамі.

Існуе клуб «Красавік» ужо дзесяць гадоў. Ён сабраў не проста людзей, якім няма дзе правесці свой вольны час, а людзей зацікаўленых. Былі ў яго рабоце і ўздымы, і спады. Найбольш складанае становішча склалася ў мінулым годзе. Тады нават на факультэце была думка аб закрыцці клуба. А справа ў тым, што касцяк савета ў пазалеташнім годзе складалі пяцікурснікі. Скончылі яны факультэт, а замены сабе не падрыхтавалі. Вось тады і прапанавалі Іры Семяньковай узначаліць савет клуба. Чаму іменна ёй? Яна рамантык, і нават крыху летуценнік. Гэта бачна адразу. Мы гутарым з Ірынай у камітэце камсамола, дзе яшчэ шумна ад размоў і спрэчак, хоць заняткі ўжо закончыліся.

Яна зусім кволая на выгляд. З гарэзлівымі іскрынкамі ў вачах, такіх адкрытых, добрых. Іра расказвае пра клуб, які стаў для яе нечым большым, чым проста месца, дзе збіраюцца яны ўсе разам, дзе нараджаюцца новыя ідэі, дзе ў спрэчках прыходзяць да ісціны. Відаць, «Красавік» стаў для Іры часткай яе жыцця, амаль што самай неабходнай.

— Спачатку заўсёды цяжка,— гаворыць Ірына. — І тое патрэбна паспець, і гэта ажыццявіць, а часу так не хапае. Але ў такой справе заўсёды галоўнае — жаданне.

«Красавік» вельмі многае значыць у іх жыцці. Сюды прыходзяць проста адвесці душу ў сардэчнай размове. Але толькі размоў, зразумела, мала. Паступова паяўлялася жаданне дзейнічаць, ад слоў пераходзіць да справы, сумеснай, творчай.

Найбольш дружная і ініцыятыўная з усіх секцый клуба — тэатр мініяцюр. З яго ўсё і пачыналася дзесяць гадоў назад. У яго свае традыцыі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Адна з іх — падрыхтоўка вечара, прысвечанага дням ФПМ. У гэтым годзе «на біс» прайшла праграма «Што такое смех і як з ім змагацца».

Запамінальнымі былі і сустрэча з артыстам тэатра імя Я. Купалы Яўгенам Нікіціным, і вечары «Музыка і мы», і вечары працоўнай славы, і шматлікія сустрэчы з выкладчыкамі кафедраў, выступленні ўдзельнікаў секцыі самадзейнай песні...

Ёсць у іх мара — ператварыць «Красавік» у клуб студэнцкай моладзі горада. Зараз зроблены пакуль што толькі першыя крокі: наладжваюцца сувязі з падшэфным ГПТВ і музычным вучылішчам.

Мне запомніліся словы Ірыны, якія яна сказала на развітанне:

— Я хачу, каб студэнты ФПМ называлі клуб «наш дом». Каб ішлі сюды людзі з жаданнем выказаць набалелае, каб кожны гаварыў тое, што думае, адкрыта, шчыра.

Вы былі калі-небудзь на вуліцы Кастрычніцкай у клубе пад назвай «Красавік»? Загляніце сюды, калі ў вас ёсць свае цікавыя думкі, прапановы. Загляніце сюды проста так, калі вам хочацца пагутарыць, паспрачацца...

Упэўнена, вам будзе цікава.

В. ШАЎЛЮК,
студэнтка факультэта журналістыкі.

— Чаму ж у вучэбным працэсе так рэдка выкарыстоўваюцца кіна- і тэлефільмы! Таму што іх няма! Як гэтаму можна дапамагчы!

— Нельга думаць, што ТСН такога тыпу могуць сістэматычна стварацца сіламі асобных кафедр, факультэтаў і нават ВНУ. Больш таго, у рамках вузкага прымянення выдаткі на стварэнне такіх ТСН наўрад ці будуць апраўданы. Сур'ёзная размова аб тэле- і кінафільмах (як ТСН) можа весціся, як мінімум, у маштабах МінВНУ рэспублікі ў комплексе з усімі аспектамі вучэбнай і метадычнай работы.

— А статычная праекцыя?

— Статычная праекцыя — справа іншая. І дыяпраектар, і кадаскоп прымяняльны, практычна, у любой аўдыторыі, у якой ёсць хаця б адна сцяна светлага колеру.

Калі б абсталяванне студэнцкіх аўдыторый тэхнічнымі сродкамі было добра прадумана, то наўрад ці паявіліся б у нас дарагія сістэмы завешвання і экраны з маторным прывадам, асноўнае прызначэнне якіх — акумуляцыя пылу. Сродкі дыя- і кадапраекцыі зараз такія, што ў вельмі рэдкіх выпадках неабходна закрываць вокны.

На працягу васьмі гадоў я хаджу на лекцыі з кадаскопам. Бяру яго з сабой таму, што не ведаю іншага спосабу зрабіць даступным і зразумелым для студэнтаў (або слухачоў ФПК) матэрыял, якім, на мой погляд, яны павінны свабодна валодаць. У нармальных умовах асвятлення можна карыстацца і дошкай, і кадаскопам, прычым студэнты маюць магчымасць весці запісы.

— Як ужо гаварылася раней, па прымяненню тэхнічных сродкаў навучання маюць даволі багаты вопыт многія ВНУ краіны. Як гэты вопыт асвятляецца ў літаратуры!

— На жаль, многія дапаможнікі па ТСН (у тым ліку з грыфам МінВНУ БССР) дапускаюць, што чытачы ў лепшым выпадку знаходзяцца на ўзроўні хатніх гаспадынь, таму вывучэнне такіх крыніц не выклікае ніякага энтузіязму па стварэнню і ўкараненню ТСН.

Не цяжка разабрацца і ў прычынах такога становішча спраў. Змешваюцца два паняцці: тэхнічная рэалізацыя, тэхнічныя характарыстыкі ТСН і методыка іх выкарыстання.

Падобныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі фактычна могуць даць веды толькі аб пабудове ТСН, як зрабіць слайды і г. д. Але кожнаму адукаванаму чалавеку зразумела, што гэтыя самыя ТСН павінны быць такімі удасканаленымі, каб выкладчык, які карыстаецца імі, не задумваўся, як яны створаны. Вы ж не задумваецеся, як працуе відэаўзмацняльнік тэлевізара, калі глядзіце рэпартаж аб футбольным матчы.

— Напэўна, больш удасканаленым і развітым тэхнічным сродкам навучання ва універсітэце з'яўляецца ТСН на базе ЭВМ!

— Я хацеў бы звярнуць увагу на некаторыя прынцыповыя асаблівасці такога выкарыстання. Заўважце, у вучэбным працэсе ЭВМ выкарыстоўваюць, як правіла, тыя, хто карыстаецца ЭВМ па роду сваёй асноўнай дзейнасці. Калі агульная культура чалавека такая, што ён можа павысіць эфектыўнасць сваёй працы за кошт выкарыстання вылічальнай тэхнікі, то, займаючыся выкладчыцкай дзейнасцю, такі чалавек будзе шукаць і знаходзіць спосабы выкарыстання гэтай жа вылічальнай тэхнікі ў вучэбным працэсе.

Асветнікамі ў галіне выкарыстання ЭВМ наогул, а ў вучэбным працэсе ў прыватнасці, павінны быць людзі, якія валодаюць вылічальнай тэхнікай і навыкамі работы з ёю. Шкада, што наш вылічальны цэнтр працуе пераважна сам па сабе, а кіраўніцтва, на мой погляд, не стымулюе вучэбна-асветніцкіх форм яго дзейнасці ў маштабах БДУ.

На шчасце, паяўленне міні-ЭВМ, якімі забяспечаны ўжо многія кафедры, і перспектывы паяўлення асабістых камп'ютэраў адкрываюць магчымасці незалежнага ад ВЦ развіцця ТСН у падраздзяленнях універсітэта.

Не магу не заўважыць: тыя, хто думае, што ЭВМ існуюць толькі для матэматыкаў, хімікаў і фізікаў, — сур'ёзна памыляюцца. ЭВМ патрэбны ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці.

— Станіслаў Станіслававіч, мы пастаянна гаворым аб вялікай загружанасці студэнтаў. Як прымяненне ТСН адбіваецца на вольным і занятым часе студэнта, уплывае на аўтарытэт ВНУ!

— Павышэнне інфармацыйнай насычанасці заняткаў, ушчыльненне вучэбнага працэсу, зніжэнне стамляльнасці студэнтаў — толькі асобныя вынікі правільнага выкарыстання ТСН. ТСН на базе ЭВМ, якія кантралююць веды, цалкам выключаюць залежнасць ацэнкі ад суб'ектыўных фактараў. Памяншэнне часу на кантрольныя пытанні садзейнічае іх больш частаму правядзенню, што ў сваю чаргу дазваляе студэнтам усвядоміць, што яны ведаюць добра, а што не зусім і г. д.

ТСН на базе ЭВМ дазваляюць назапашваць вопыт асобных выкладчыкаў нават тады, калі аўтар пакідае калектыў. Гэты вопыт не губляецца — памяць ЭВМ моцная.

— Такім чынам, няўменне, нежаданне выкарыстоўваюць ТСН выклікае капітальныя страты вучэбнага і рабочага часу. І сумна: наш універсітэт адстае ў справе ўкаранення ТСН...

— А правільней — у справе навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу ў цэлым. Больш таго, у адносінах ТСН, якія можна зараз аднесці да ардынарных, мы адстаём не толькі ад вышэйшых навучальных устаноў, але і ад ГПТВ і школ.

Па прыклады далёка хадзіць не трэба. Насупраць будынка нашага філалагічнага факультэта—школа № 4. Тут кабінетная сістэма, замкнёная тэлевізійная сістэма з вялікай колькасцю незалежных праграм, прадуманая радыёфікацыя і інш.

За пяцьсот метраў ад галоўнага корпуса БДУ — Інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў ГПТВ. Па-сапраўднаму абсталяваны класы з эпі-, дыя- і кодапраекцыяй... У пачатку мая гэтага года я пераканаўся, што і ў Магілёўскім педагагічным з ТСН куды лепш.

Чаму гэта так? Па вельмі простай прычыне — у маштабах БДУ справай ТСН не займаецца ніхто, дакладней — ніхто з тых, хто па-сапраўднаму разумее, што такое ТСН і навошта гэта патрэбна. А справу гэту неабходна не толькі арганізаваць, а і арганізаваць навукова абгрунтаваным чынам.

Інтэрв'ю правяла
А. МАТУСЕВІЧ,
наш кар.

КАМАНДА ПРЫМАЕ ВІНШАВАННІ

НАША ГАЗЕТА ўжо паведамляла аб тым, што жаночая зборная універсітэта па баскетболу выйграла кубак БССР. На мінулым тыдні з гэтай нагоды на ўрачыстым сходзе каманду віншавалі намеснік сакратара парткома універсітэта Л. А. Паўловіч, старшыня прафкома студэнтаў А. Д. Кішкевіч, старшыня спортклуба А. С. Балдзін.

Потым выступіў трэнер каманды, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту В. Я. Шхіньян. Ад імя спартсменак ён падзякаваў за шчырыя віншаванні, расказаў аб гульні баскетбалістак. «З кожным годам павышаецца майстэрства спартсменак, — сказаў ён. — Але не меншае значэнне ў дасягненні поспеху мае і тое, што ў нас склаўся добры калектыў. Цяпер баскетбалісткі рыхтуюцца да усесаюзных студэнцкіх гульняў». Была выказана ўпэўненасць у тым, што каманда не спыніцца на дасягнутым.

У заключэнне сходу А. Д. Кішкевіч уручыў баскетбалісткам узнагароды.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

НА ЗДЫМКУ: трэнер В. Я. Шхіньян, капітан каманды Рыта Хаткевіч і Аксана Чарнова пасля ўзнагароджання.

Фота **В. Чарняўскага.**

● ПАТРАБУЕ ВЫРАШЭННЯ

ТОЛЬКІ ДЛЯ СПРАВАЗДАЧЫ

ВАМ, НАПЭЎНА, надакучыла чытаць адно і тое ж многа разоў? І зусім абураецеся, калі мінулагодні матэрыял выдаюць за самы свежы? Нешта такое ўгледзелі і мы, калі па заданню спартыўнага клуба правяралі наглядную агітацыю на факультэтах. Нас цікавілі, перш за ўсё, спартыўныя стэнды і насценгазеты.

На юрыдычным факультэце вялікімі літарамі напісана: «Ход XXXII спартакіяды універсітэта 1983—1984 навучальнага года». Здаецца, усё ў парадку, калі не лічыць, што крыху размазана фарба. Але ў самой табліцы — мінулагоднія даныя. Старыя матэрыялы ў табліцы «Нашы рэкорды». А «Састаў спортбюро» ўвогуле здзіўляе, бо тут знаходзіш прозвішчы людзей, якія закончылі факультэт.

Але «рэкорды» юрфака пабіў хімфак. Там спартыўны стэнд упрыгожвалі лічбы за 1981—1982 гады. І чаго толькі тут не было: аб'явы прафбюро і камітэта камсамола, газеты будатрадаў, аб'явы для донараў, толькі ніякіх свежых спартыўных атрыбутаў. Лепей ужо не мець стэнда, як на мехмаце, чым мець такі.

Вы, напэўна, любіце не толькі свежую інфармацыю, але і разнастайную? Раім не хадзіць на гістарычны факультэт, бо стэнд там сапраўды новы, але табліцы не пачыналі запаўняць. І толькі можна даведацца аб саставах спортбюро і камісіі па здачы норм ГПА. Дарэмна крыўдзяцца гісторыкі на нашу крытыку, таксама, як і фізікі. На фізфаку — цудоўны стэнд, па знешняму выгляду яму няма роўных ва універсітэце. Але ён расказвае толькі аб мінулым факультэта, калі фізфак быў бясспрэчным лідэрам універсітэцкага спорту. А дзе сённяшні дзень?

Усім факультэтам патрэбна браць прыклад з факультэта радыёфізікі і электронікі. Там на стэндзе змешчаны даныя па здачы нарматываў комплексу ГПА, па ходу спартакіяды, планы работы спортбюро, саставы зборных каманд, асобна вывешаны партрэты лепшых спартсменаў. Прыйшоў хто сюды, прачытаў — і адразу пазнаёміўся са спартыўным жыццём факультэта.

Высокай якасцю вызначаецца стэнд ФПМ. Разнастайную інфармацыю можна атрымаць на біяфаку, але знешняе афармленне не на ўзроўні.

Пабывайце, калі ласка, на філалагічным факультэце. Вы там убачыце сляды бяздзейнасці спортбюро, бо спартыўны стэнд, які быў абноўлены ў пачатку навучальнага года, прыйшоў у непрыгоднасць. Першая частка, дзе напісаны нарматывы комплексу ГПА, відаць, была зроблена ў той час, калі паявіўся і сам комплекс. Папера выцвіла, а дзве астатнія часткі дубліруюць адна адну — напісаны саставы зборных каманд. Мы аж здзівіліся — няўжо на філфаку столькі спартсменаў?! Не, проста запісаны «мёртвыя душы». А побач знаходзіцца стэнд, дзе павінна вісець спартыўная газета. Але як ні прыглядайцеся — вы яе не знойдзеце, як і слядоў, што пацвердзілі б яе прысутнасць. У спортклубе ж значыцца адзінаццаць насценных газет?!

Дарэчы, толькі на факультэце радыёфізікі і электронікі мелася насценная газета, праўда, стараватая. Вы можаце не паверыць, але гэта факт. Калі праходзіў конкурс спартыўных насценгазет ва універсітэце, то юрфак, гістфак, ФПМ, мехмат заявілі, што ўдзельнічаць у ім не будуць з-за адсутнасці газет. На конкурс прадставілі свае насценкі ўсяго пяць факультэтаў: журфак, факультэт радыёфізікі і электронікі, геафак, хімфак і біяфак. Астатнім было сорамна паказваць свае газеты.

Але ў аглядзе-конкурсе на лепшую пастаноўку спартыўнамасавай работы на факультэтах гэта не ўлічваецца. Насценгазеты ацэньваюцца па колькасці, а не па якасці. Прынясеш газету на адным лісце — пяць вачкоў, на двух—дзесяць. Прычым фотагазета ацэньваецца вышэй, хоць яе лягчэй зрабіць. Вось і атрымліваецца, што ў гэтым годзе ні адну з газет нельга паказваць за межамі універсітэта — сорамна. У раздзеле агляду-конкурсу верх бяруць філфак і юрфак, дзе газеты нават не вывешваюцца. А журфак, геафак, хімфак, факультэт радыёфізікі і электронікі аказваюцца ў пройгрышы. Спортклубу патрэбна перагледзець палажэнне, даўно ўжо пара паставіць заслону для бракаробаў.

Можна многа гаварыць аб спартыўных вечарах, лекцыях, гутарках, але гэта зойме шмат месца. Адзначым, што на факультэтах прапаганда фізкультуры і спорту наладжана слаба. Спортбюро факультэтаў у наступным навучальным годзе патрэбна будзе ліквідаваць недахопы, а спортклубу не стаяць у баку, а даваць канкрэтныя парады і ўказанні. Ці не так?

А. КУЛІНКА,
член праўлення спортклуба;
У. АБРАМОВІЧ,
наш кар.

● СПАРТЫЎНЫЯ ГАРЫЗОНТЫ

ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎЯЎЛЯЮЦЦА МАГЧЫМЫМІ

У ПЕРШЫНСТВЕ універсітэта па класічнай барацьбе ўдзельнічала звыш 80 чалавек з усіх факультэтаў. Многа гэта ці мала? Многа, бо сёлета да спаборніцтваў дапускалі толькі тых, хто займаецца ў спартыўных секцыях ці ў вучэбных групах па барацьбе.

У спартыўную секцыю па класічнай барацьбе прымаюць усіх жадаючых, у адрозненне ад іншых секцый. Заняткі з навічкамі праводзіць Віктар Фёдаравіч Сапун, а з вопытнымі барцамі займаецца Віктар Аляксандравіч Рудзянкоў.

Універсітэцкіх барцоў ведаюць ва ўсёй рэспубліцы. Калі праходзяць першынствы абласавета і Белсавета ДСТ «Буравеснік», то трэнеры не хвалююцца. І юніёры, і дарослыя займаюць першыя агульнакамандныя месцы. Прывыклі да нашых спартсменаў і на чэмпіянатах рэспублікі. А сёлета два студэнты выступалі на чэмпіянаце СССР. Камандар Маджыдаў (юрфак) дабіўся бліскучых перамог на Кубку свету і чэмпіянаце Еўропы.

Камандар — лідэр універсітэцкай каманды. Яго вызначаюць апантанасць, працаздольнасць, настойлівасць і сціпласць. І можна быць упэўненым, што яшчэ не раз майстар праслявіць універсітэцкі спорт на міжнароднай арэне.

Браты Каржэлі — Вадзім і Святаслаў — студэнты трэцяга курса геафака. Вадзім выступае ў вагавой катэгорыі да 82 кг. Ён — майстар спорту, член зборнай каманды БССР. У гэтым навучальным годзе Каржэль заняў трэція месцы на першынствах Цэнтральнага савета сярод дарослых і юніёраў, спрабаваў свае сілы на чэмпіянаце СССР сярод дарослых, а на першынствах Белсавета двойчы выходзіў пераможцам.

Яго брат Святаслаў — кандыдат у майстры спорту. У вагавой катэгорыі да 74 кг ён стаў прызёрам Цэнтральнага савета сярод юніёраў, выйграў першынство Белсавета сярод юніёраў і быў у прызёрах сярод дарослых.

Майстар спорту пяцікурснік юрфака Мікалай Рубіс лічыцца ветэранам. Нялёгка ў яго выйграць, таксама, як і ў кандыдата ў майстры Уладзіміра Гуля (ФПМ). Стаўшы прызёрамі першынства Белсавета, яны яшчэ раз пацвердзілі свой клас. У гэтых спаборніцтвах першае месца заняў другакурснік факультэта радыёфізікі і электронікі Сяргей Тырсікаў (да 48 кг). Паспяхова выступілі на юніёрскім турніры студэнты геафака Юрый Сіўцоў (першае месца) і Андрэй Казлоў (трэцяе месца). Васіль Белавусаў (юрфак), Алег Харанека, Валянцін Караканіца (геафак) не раз паспяхова абаранялі гонар нашай каманды.

Амаль ва ўсіх катэгорыях мы маем нядрэнных барцоў. Але шэраг спартсменаў заканчвае універсітэт. Тым не менш трэнеры глядзяць у будучыню з аптымізмам — упэўнены, што знойдуць ім замену.

Трэніроўкі барцоў праходзяць даволі эфектыўна. Навічкі і разраднікі трэніруюцца па тры разы на тыдзень, а члены зборнай — па шэсць, прычым яны займаюцца ў Рэспубліканскім Доме фізкультуры, дзе іх настаўнікамі з'яўляюцца і трэнеры зборнай каманды БССР.

На секцыю прыходзяць студэнты з рознымі мэтамі. Адны раней займаліся (такіх мала), другія — каб набыць добрае здароўе, трэція не хочуць наведваць заняткі фізкультуры на стадыёне. Зразумела, што тут цяжка знайсці добрых спартсменаў. Многія трэнеры не бяруць студэнтаў, якія не маюць разрадаў,— работы шмат, а аддачы можа не быць. У класікаў наадварот. Хуткай аддачы не чакаюць, але пастаянна ідзе пошук перспектыўных барцоў. Напрыклад, восенню В. Сапун запрасіў у секцыю першакурсніка філфака Дзіму Няхая. Не таму, што падаваў надзеі,— не было барцоў у катэгорыі да 52 кг. Першыя свае спаборніцтвы — першынство Белсавета сярод юніёраў — ён прайграў, а на першынстве абласавета заняў першае месца, прычым выйграў у Сяргея Тырсікава.

Трэнеры ў сваёй рабоце абапіраюцца, галоўным чынам, на тры факультэты: юрыдычны, геаграфічны і фізічны. Асабліва шмат дапамогі адчуваецца з боку спортбюро юрфака, дзе адказным за класічную барацьбу з'яўляецца Васіль Белавусаў. Штогод звыш дзесяці першакурснікаў прыходзяць у секцыю і застаюцца тут надоўга. У гэтым бачыцца залог поспеху юрфака на першынстве універсітэта.

З году ў год павышаецца майстэрства спартсменаў. Поспех прыходзіць да самых працавітых і настойлівых. У наступным навучальным годзе мараць стаць майстрамі спорту С. Каржэль, У. Гуль, С. Тырсікаў, В. Белавусаў. Ці здзейсняцца мары — залежыць ад іх саміх. Святаслаў не раз спыняўся за крок да ганаровага звання. Фізічна моцны і даволі тэхнічны, Гуль цяпер на пад'ёме. Не хапае яму толькі ўпэўненасці ў сабе. Значна за гэты год прыбавіў Белавусаў. Даўно мог бы стаць майстрам Тырсікаў. Але Сяргей не спяшаецца. Не хапае яму сур'ёзных адносін да справы.

— Галоўная наша задача,— гаворыць В. А. Рудзянкоў,— паспяхова выступіць на Усесаюзных студэнцкіх гульнях. Турнір па класічнай барацьбе будзе праходзіць у Мінску з сёмага ліпеня. Аснову беларускай каманды складуць універсітэцкія спартсмены.

У класікаў, як і ў іншых спартсменаў універсітэта, цяпер настаў перапынак у трэніроўках. Выключэнне складаюць члены зборнай. Хто ў гэтыя дні заканчвае здаваць сесію, хто ўжо збіраецца на практыку. Зразумела, не ўсе летам будуць трэніравацца самастойна. Але ў кастрычніку яны зноў прыйдуць у спартыўную залу.

В. БАБЕЙ,
студэнт факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

14 чэрвеня 1984 г.

АТ 10279 Зак. 1015.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ